УДК 811.161.3’373.2:821.161.3

**В. Р. Слівец**
Кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык, кафедра педагогікі і псіхалогіі
УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна»,
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

# ПРЭЦЭДЭНТНЫЯ ФЕНОМЕНЫ СЕМАНТЫЧНАГА ПОЛЯ «АНТЫЧНАСЦЬ» У ПАЭТАНІМІКОНЕ ТВОРАЎ МАКСІМА ТАНКА

*Артыкул прысвечаны апісанню спецыфікі і спосабаў функцыянавання прэцэдэнтных феноменаў семантычнага поля «Антычнасць» у паэтаніміконе твораў Максіма Танка. Сістэматызаваны корпус адпаведных адзінак, і зроблена выснова, што ўніверсальна-прэцэдэнтны характар разгледжаных уласных імёнаў садзейнічаў стварэнню шырокага інтэртэкстуальнага кантэксту, а таксама абумовіў іх ужыванне ў якасці экспрэсіўна-ацэначных і вобразастваральных сродкаў.*

*Ключавыя словы і словазлучэнні: анамастычная метафара, інтэртэкстуальнасць, міфаперсонім, міфонім, параўнанне, паэтанімікон, прэцэдэнтны феномен, тапонім.*

## Уводзіны

Антычную культуру па праву лічаць унікальнай з’явай, бо яе міфалогія, гераічны эпас, мастацтва, філасофія і навука набылі агульначалавечае значэнне, вытрымаўшы выпрабаванні часам, усімі гістарычнымі, грамадскімі і светапогляднымі пераўтварэннямі, што выпалі на долю сусветных цывілізацый. Станаўленне многіх лакальных культур засноўваецца на пераасэнсаванні менавіта антычных дасягненняў і ідэалаў як трывалага падмурку для ўкаранення самабытных народных традыцый: «вобразы антычнай міфалогіі даўно і трывала ўвайшлі ў сістэму вобразаў нацыянальных літаратур і культур, што сведчыць аб адзінай еўрапейскай культурнай прасторы, у якой мы існуем. І, нягледзячы на старажытнасць дадзеных з’яў мастацтва, яны працягваюць бытаваць у літаратуры, але не проста слепа запазычваюцца паэтамі і пісьменнікамі, а пераапрацоўваюцца, уключаюцца ў новы кантэкст і набываюць новае жыццё, новае гучанне» [1].

Ступень уплыву міфалагічнай спадчыны эпохі Антычнасці ў беларускай мастацкай літаратуры не перастае цікавіць даследчыкаў. Сістэмным апісаннем асаблівасцей ідэйна-мастацкага асваення міфалагічных сюжэтаў і вобразаў у літаратуры XVI–XX стст. стала грунтоўная праца В. Каваленкі [2]. Умовы і характар засваення антычнага вопыту ў беларускай паэзіі разглядаліся ў гістарычна-тэарэтычным нарысе А. Кабаковіч [3]. Вывучэнню антычнай традыцыі ў айчынным мастацтве слова XIX – пачатку XX ст. прысвечана дысертацыйнае даследаванне Д. Лебядзевіча [4]. Адметнасці міфа-паэтычнага мыслення ў мастацкай парадыгме беларускай класічнай літаратуры прааналізаваны Т. Шамякінай [5]. Навукоўцамі таксама актыўна даследуецца рэпрэзентацыя антычных ідэй і матываў у мастацкіх дыскурсах асобных аўтараў: Ф. Багушэвіча, У. Дубоўкі, Я. Лучыны, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. (акрамя ўжо названых, гэта працы У. Конана, Ю. Дрэйзіна, А. Адамовіча, Г. Адамовіч, С. Малюковіч і інш.). Зусім іншы аспект праблемы падаецца ў даследаванні Г. Юдзянковай, якая на матэрыяле мастацкіх твораў беларускіх пісьменнікаў другой паловы XIX ст. разгледзела асноўныя спосабы канатацыйнага ўжывання прэцэдэнтных антрапонімаў, што генетычна ўзыходзяць да сферы-крыніцы «Міфалогія» [6].

Многія літаратуразнаўцы (А. Пісьмянкоў, Р. Бярозкін, Д. Бугаёў, В. Рагойша, М. Арочка, М. Мікуліч, С. Малюковіч, А. Жыганава і інш.) адзначалі арыгінальнасць мастацкай рэпрэзентацыі праяў антычнай культуры ў лірыцы Максіма Танка, увогуле адметнай сваім шырокім тэматычна-вобразным дыяпазонам і высокім ідэйна-эстэтычным узроўнем. Лексічную структуру паэтычных тэкстаў М. Танка аналізавалі Э. Блінава, Г. Волкава, В. Сайкоўская, А. Супрун і інш. лінгвісты, аднак паэтанімікон (як сукупнасць усіх уласных імёнаў у мастацкім тэксце) і патэнцыял яго стылістычнага выкарыстання ў вершах гэтага аўтара яшчэ не атрымалі сістэмнага навуковага апісання. Між тым, мы падзяляем думку У. Ніканава, які лічыць, што аналіз функцый паэтонімаў пры стварэнні мастацкіх вобразаў прадугледжвае перапляценне лінгвістычных і літаратуразнаўчых метадаў [7, с. 18]. Таму мэтаю нашага даследавання і стала апісанне спецыфікі і спосабаў функцыянавання прэцэдэнтных феноменаў у паэтаніміконе твораў М. Танка, якія належаць да семантычнага поля «Антычнасць», і вызначэнне іх ролі ў стварэнні ідэйна-мастацкага кантэксту.

© Слівец В. Р., 2023

МДПУ імя І. П. Шамякіна

**Метады і метадалогія даследавання**

Метадалогія даследавання грунтуецца на спалучэнні апісальна-інтэрпрэтацыйнага і стылістычнага метадаў вывучэння онімных адзінак, сабраных шляхам суцэльнай і мэтавай выбарак з мастацкіх тэкстаў М. Танка, іх кантэкстуальны аналіз, прыёмы колькаснага падліку і лінгвакультуралагічнае каменціраванне.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне**

Асаблівасць творчасці М. Танка бачыцца ў тым, што яна сінтэзуе традыцыі нацыянальнага мастацтва слова, якія склаліся ў галіне трактоўкі антычных вобразаў і матываў, і ўласнааўтарскага падыходу ў пераасэнсаванні паэтыкі і вобразнай спадчыны антычнай літаратуры і культуры. Лічым, што мысленне падобнымі катэгорыямі заканамерна адбілася і на паэтаніміконе твораў М. Танка, насычанага прэцэдэнтнымі феноменамі, значная частка якіх належыць да семантычнага поля «Антычнасць».

Намі былі прааналізаваны паэтычныя тэксты М. Танка, напісаныя ім у 1930–1995 гг., з якіх шляхам суцэльнай выбаркі адабраны ўласныя імёны розных лексіка-семантычных разрадаў агульнай колькасцю 1652 адзінкі (без уліку паўтораў і словаўжыванняў). Былі таксама разгледжаны кантэксты ўжывання вылучаных паэтонімаў і на аснове гэтага сістэматызаваны корпус онімных адзінак, якія можна кваліфікаваць як прыналежныя да семантычнага поля «Антычнасць». У выніку склаліся наступныя групы імёнаў:

1. Уласныя імёны старыжытнагрэчаскіх і старажытнарымскіх філосафаў, прадстаўнікоў антычнай навукі, літаратуры і мастацтва (онімы, якія маюць рэальныя дэнататы): *Авідзій, Вергілій, Гамер, Гарацый, Герадот, Геракліт, Дыяген, Піфагор, Платон, Плутарх, Сакрат, Сафокл, Фідзій, Эўрыпід.* Увядзенне падобных імёнаў у мастацкі тэкст (у тым ліку ў якасці біблёнімаў, у эпіграфах да вершаў) сведчыць не толькі аб дасведчанасці аўтара, энцыклапедычнасці яго ведаў, але і пашырае інтэлектуальна-філасофскі дыяпазон яго твораў, паглыбляе іх ідэйнае гучанне. Нярэдка паэт па-мастацку арыгінальна пераасэнсоўвае вядомыя цытаты, выказванні антычных філосафаў, з павагай ставячыся да вопыту мудрых папярэднікаў. Напрыклад: *У рукі возьмеш мармур спарахнелы, / Не знаеш, ці ад сонца ён гарачы, / Ці ад гекзаметраў, што празвінелі / У тыя дні, калі тварыў Гарацый* [8, т. 3, с. 82]; *Яму прысвоілі званне Героя / За тое, што двойчы / Фарсіраваў Бярэзіну <…> // Каб знаў Геракліт пра такіх, / Не сказаў бы, што нельга / Двойчы перайсці / Праз адну і тую ж раку* [8, т. 4, с. 196]; *Па тым, што нас, паэтаў, / Не выганяюць, а нат запрашаюць / На розныя фэсты, / Урачыстасці, юбілеі, / Мяркую, паводлуг Платона, / Што мы яшчэ жывём / Не ў ідэальнай дзяржаве* [8, т. 6, с. 138]. Такія «дыялогі» і нават «палемікі» ў сваю чаргу ствараюць асобую інтэртэкстуальнасць, «повязь» культур і эпох у мастацкім тэксце. Гэта становіцца магчымым дзякуючы прэцэдэнтнаму характару пералічаных уласных імёнаў.

2. Артыёнімы – назвы выдатных помнікаў гераічнага эпасу эпохі Антычнасці: *«Адысея», «Іліяда».* Верагодным аўтарам названых паэм, як вядома, лічыцца Гамер, які для М. Танка з’яўляецца эстэтычным арыенцірам і мерай вартасці, мастацкага ўзроўню паэтычнага слова. Дзякуючы гамераўскім творам еўрапейская культура ўзбагацілася сюжэтамі, вобразамі і імёнамі, якія былі запазычаны сусветным мастацтвам розных відаў. Цэлы пласт лексікі з «Адысеі» і «Іліяды», набыўшы пераноснае, вобразнае значэнне, увайшоў у фразеалагічны фонд шматлікіх моў свету. Шэраг уласных імёнаў таксама метафарызаваўся і апелятызаваўся. Напрыклад, *«Адысея»* → *адысея* ‘доўгае вандраванне, поўнае дзіўных прыгод і цяжкіх выпрабаванняў’ [9]. Параўн. у М. Танка: *...Калі дарогі пашарэюць / І вецер з поўначы мацней / Ў імгле зацягне адысею / З крылатым табарам гусей...* [8, т. 1, с. 138]; *Вось і сягоння / Стаю ля бацькаўскага парога, / Чакаю: ці даруюць? // І ў той жа час / Аб новай мару Адысеі* [8, т. 5, с. 169]. У дачыненні да самога Гамера М. Танк выкарыстоўвае перыфразу *пясняр «Іліяды»*, што набывае ўстойлівы характар дзякуючы прэцэдэнтнасці назвы мастацкага твора і імя яго аўтара, да якога скіроўвае гэты апісальна-іншасказальны выраз: – *Кінь, пясняр «Іліяды», / Сваю несканчоную працу* [8, т. 4, с. 229]. Увогуле самі творы – «Іліяда» і «Адысея» – з’яўляюцца прэцэдэнтнымі тэкстамі.

3. Тапонімы, якія выкарыстоўваюцца аўтарам у якасці назваў рэальных геаграфічных аб’ектаў, што ў мастацкім кантэксце ствараюць вобразы антычнага свету (*Акропаль, Афіны, Грэцыя, Дэльфы, Калізей, Парфенон, Троя, Форум Раманум / Форум, Рым, Элада*), і як міфатапонімы (*Алімп / Алімпійская гара, Аркадзія, Атлантыда, Лета, Пантэон, Парнас, Слупы Геркулеса, Сцікс*).

Прастора і час мастацкага тэксту – формы быцця эстэтычнай рэальнасці, своеасаблівыя інструменты яе мадэлявання. Натуральна, што ў гэтай створанай аўтарскім уяўленнем рэчаіснасці

МГПУ им. И. П. Шамякина

важнае месца належыць тапонімам, бо, акрамя традыцыйнай функцыі геаграфічнай намінацыі, у літаратурным творы яны адыгрываюць асобую стылістычную ролю. Іх змястоўна-інфарматыўны патэнцыял не вычэрпваецца каардынатамі размяшчэння тых ці іншых аб'ектаў. У семантычнай структуры тапонімаў, паводле У. Ніканава, акрамя да-тапанімічнага (этымалагічнага), уласна тапанімічнага (прамога геаграфічнага), прысутнічае і ад-тапанімічнае (асацыятыўнае) значэнне [10, с. 57–63], за кошт чаго яны здольны выклікаць у свядомасці чытача (рэцыпіента) не толькі шэраг асацыяцый – прасторавых (лакальных), часавых (тэмпаральных) і інш., але і выступаць своеасаблівым абазначэннем, сімвалам вызначальных падзей, гістарычных працэсаў, культурных набыткаў, дасягненняў. Так, М. Танк называе Грэцыю *«краінай міфаў»* («У краіне міфаў»). Іншыя з названых рэальных тапонімаў дзякуючы сваёй прэцэдэнтнасці таксама змяшчаюць багатую экстралінгвістычную інфармацыю і культурную канатацыю. Параўн.: *І стары Парфенон / Стаіць змоўклай святыняй, з якой / Павыносілі рабаўнікі / І багоў і багіняў* [8, т. 3, с. 87]; *Быў і на радзіме тваёй* [*Авідзія.* – В. С.], */ Дзе сярод пылу і друзу / Форума і Калізея, / Калон старажытнага Рыма / Знаходзіў асколкі / Гекзаметраў гулкіх тваіх* [8, т. 4, с. 200].

Асноўная задача ўжытых аўтарам у мастацкім тэксце міфатапонімаў – стварэнне міфалагічнага дыскурсу.

4. Міфаперсонімы. Пад гэтым тэрмінам мы аб'ядналі ўласныя імёны багоў, дэманічных істот і іншых герояў антычных міфаў і эпасу. Прычым сярод выяўленых паэтонімаў зафіксаваны моўныя адзінкі, сферамі-крыніцамі якіх выступаюць старажытнагрэчаская і старажытнарымская міфалогія: *Адысей, Акіян, Амур, Апалон, Арыядна, Атлас, Афіна / Палада, Афрадыта, Ахілес, Венера, Галатэя, Дыяніс, Зэт, Ікар, Медэя, Мідас, Муза, Наўсікая, Ніка / Самафракійская Ніка, Паліфем, Пасейдон, Пегас, Пенелопа, Пігмаліён, Піфія, Праметэй, Сатыр, Сціла, Феміда, Харон, Харыбда, Хімера, Цыклоп, Эней, Эол, Эрэб, Юнона*.

Выяўлены корпус уласных імёнаў антычнага паходжання складае 4,5 % ад агульнай колькасці паэтонімаў, зафіксаваных у прааналізаваных вершах М. Танка. У ранніх паэтычных зборніках аўтара, т. зв. давераснёўскага перыяду, – «На этапах» (1936), «Журавінавы цвет» (1937) – такія моўныя адзінкі ўвогуле адсутнічаюць, што, відаць, можна растлумачыць агульнай ідэйнай скіраванасцю гэтых зборнікаў. У больш позні творчы перыяд, з узрастаннем філасофска-аналітычнага, медытатыўнага характару лірыкі паэта, частотнасць ужывання падобных онімаў і выкарыстанне М. Танкам антычных вобразаў і матываў павялічваецца. Напрыклад, у зборніках «Хай будзе святло» (1972) – 10 %, «Дарога, закалыханая жытам» (1976) – 15,7 %, «Прайсці праз вернасць» (1979) – 7,9 % і г. д. У адным з вершаў («Пахвала "гісторыі"») М. Танк, не без уласцівай яму іранічнасці, так тлумачыў змену прыярытэтаў у выбары тэм і праблематыкі сваіх твораў*: Надакучылі ўдарныя тэмы / У нашых п'есах, раманах, паэмах. // Толькі выпусціш на свет героя – / Як яго тармасіць пачынаюць. // Дастаецца і творцу за тое, / Што патрэб свайго часу не знае. / А патрэбы, прызнацца, – цяжкія, / Кожны тыдзень ці месяц – другія. // Вось і вабяць біблейскія годы / І гамераўскія падарожжы, / Фантастычныя бітвы, прыгоды, / Ў якіх чорт ногі выкруціць можа…* [8, т. 6, с. 184]. Даследуючы спецыфіку ўвасаблення антычных вобразаў у лірыцы М. Танка 80–90-х гг., А. Жыганава прыходзіць да высновы, што наяўнасць у яго паэтычных творах «мноства ўніверсальных культурных кодаў (антычных, біблейскіх і інш.)», якія дапамагаюць паэту «растлумачыць самога сябе свету, а праз самога сябе – і свой народ, і сваю Радзіму», з'яўляецца заканамернай з'явай для беларускай паэзіі XX стагоддзя як неад'емнай часткі еўрапейскай культуры, якая характарызуецца працэсамі глабалізацыіі, мультыкультурнасцю грамадства [1].

У кантэксце нашага даследавання цікавасць уяўляюць спосабы функцыянавання міфонімаў, якія большасцю рэцыпіентаў успрымаюцца ў якасці ўніверсальна-прэцэдэнтных феноменаў. Сама прырода прэцэдэнтных моўных адзінак дазваляе аўтарам мастацкіх тэкстаў шырока ўжываць іх у якасці культурных знакаў, сімвалаў пэўных уласцівасцей, а багаты канатацыйны патэнцыял абумоўлівае шырокае функцыянаванне ў складзе анамастычных метафар. Напрыклад: *Мала славы табе, / Якой нат на Алімпе зайздросцяць* [8, т. 4, с. 229]; *Відаць, сярод багоў Алімпа, / З якімі некалі дружыў, / Ты* [*І. П. Катляrэўскі.* – В. С.] *– самы непрыкметны, сціплы – / Сапраўдным, мудрым богам быў* [8, т. 6, с. 175]. Параўн.: *Алімп* – 1. У грэчаскай міфалогіі: прытулак, а таксама сход багоў; 2. Абранае кола, вяршыня якога-небудзь грамадства (*літаратурны алімп*; *узляцець на алімп* 'дасягнуць вышынь у якім-небудзь родзе дзейнасці') [11, с. 712]. Увогуле, як ужо адзначалася, многія з пазначаных міфонімаў набылі метафарызаванае значэнне, увайшлі ў склад устойлівых выразаў: *конь траянскі*, *пята Ахілеса*, *нітка Арыядны*, *сізіфава праца*. Усе пералічаныя прыклады былі засведчаны і па-мастацку пераасэнсаваны ў танкаўскіх вершах: *…Не пакідайце недапітых чарак, / Губ неда-*

МГПУ им. И. П. Шамякина

*цалаваных, недапетых песень / І брам, адчыненых начной парою, / Каб хто каня траянскага не ўвёў* [8, т. 5, с. 164]; *Я ж па драбіне песні / З пекла мінуўшчыны / Ўздымаюся да сваёй мары. // Толькі, калі да яе набліжаюся, / Кожны раз яна / Спуджанай птушкай / Ўзлятае вышэй. // Кажуць: сізіфава праца. // Але ніхто мяне не змусіць / Яе спыніць* [8, т. 5, с. 54]; *Некалі нейкі гісторык, / Філосаф, / Разважаючы аб чалавечых / Недахопах, / Успомніўшы пра слабасць / Пяты Ахілеса, / Пра няўтольную прагнасць / Мідаса да золата, / Пра цягу Калумба / Да вар'яцкіх вандровак, / Пра захапленн Каперніка / Зззяннем зор, – / Напэўна, не абміне сказаць / І пра мой недахоп – Пісанне вершаў* [8, т. 6, с. 149–150]; *Калісьці, / Легкадумна заглыбіўшыся / У лабірынце сваіх / Пошукаў Праўды, / Узяць забыўся нітку Арыядны* [8, т. 6, с. 202].

Любы мастацкі троп, у склад якога ўваходзіць прэцэдэнтны паэтонім, мае алюзійны характар, што звязана з асобай гісторыка-культурнай інфарматыўнасцю прэцэдэнтных феноменаў. Ужыванне ў тэксце міфаперсонімаў (міфатэонімаў, міфаантрапонімаў і інш.), як правіла, узнаўляе сюжэты адпаведных міфаў і легенд, якія па сутнасці з'яўляюцца прэцэдэнтнымі тэкстамі: *Можа, паэ / У цемры, што раскрылася прад ім, / Хацеў убачыць / Другі бераг Сцікса, / Адкуль Харон / Плыў па яго* [8, т. 4, с. 194]; *Бо і я, калісьці згубіўшы / Клубок Арыядны, / Ніяк з лабірынта дзён / Не магу вярнуцца / Да свайго юнацтва* [8, т. 4, с. 207]; *Правяраю эстафету: / Праметэй, які вырваў агонь з рук Зеўса, / Перад тым як закулі яго ў ланцугі, / Галавешку паспеў перадаць майму продку* [8, т. 4, с. 235]. Як бачна з прыведзеных прыкладаў, вядомыя шырокаму колу рэцыпіентаў міфалагічныя сюжэты пераасэнсоўваюцца аўтарам і атрымліваюць новую інтэрпрэтацыю.

Анамастычная метафара валодае ярка выражанай экспрэсіўнасцю. Гэта абумоўлена тым, што аб'ект намінацыі, як правіла, атрымлівае шэраг асацыяцый, за кошт чаго ўключаецца ў складаную сістэму экстралінгвістычных падтэкстаў. Напрыклад: *Стаю ля сапсутага аўтамата. // Кінуў адну манету – не дае вады. // Кінуў другую – тое ж самае. // А прыйшла Афрадыта, якая толькі што / Выплыла з хваль, – ён наліў ёй шклянку / Асвяжальнай газіраванай, з сіропам. // Відаць, і мае медзякі ёй аддаў бы, / Калі б не паклікаў яе Акіян – / Разззлаваны, зайздросны* [8, т. 4, с. 178–179]. У дадзеным прыкладзе паэтонім *Афрадыта* ўспрымаецца як эталонная сукупнасць пэўных якасцей (параўн.: *Афрадыта* – у старажытнагрэчаскай міфалогіі багіня прыгажосці і кахання). Дадатковыя вобразныя дэталі, якія можна кваліфікаваць як атрыбуты прэцэдэнтнага імя, узнаўляюць сюжэт вядомага міфа аб яе нараджэнні – з марской пены і хваляў, а таксама іншы прэцэдэнтны невербальны тэкст – карціну Сандра Баціччэлі «Нараджэнне Венеры».

Выпадак арыгінальнай мастацкай рэпрэзентацыі невербальнага (выяўленчага) «кода» *Афрадыты-Венеры* знаходзім у вершы М. Танка «Венера Мілоская», які транслюе выдатны прыклад ужывання экспрэсіўна-ацэначнай анамастычнай метафары: *Як жа знайсці мне яе* [*Венеру Мілоскую*. – В. С.] *тут, дзе поўна / Розных Палад, Афрадытаў, Медэяў? // Добра, што ты мне, Вергілій, прыпомніў: / «Et vera incessu petuit dea»* [8, т. 3, с. 77]. Ацэначны характар анамастычная метафара набывае за кошт стварэння стэрэатыпа, эталона, абумоўленага ўспрыманнем аб'екта, абазначанага прэцэдэнтным імем, як узорнага прадстаўніка, выразніка пэўнай якасці: *Венера Мілоская* – 'ідэал жаночай прыгажосці'. Ужытыя ў форме множнага ліку міфаперсонімы *Палада*, *Афрадыта*, *Медэя* таксама сведчаць аб здзяйсненні праз гэтыя ўласныя імёны пэўнай ацэначнай функцыі.

Часам у спалучэнні з універсальна-прэцэдэнтнымі моўнымі адзінкамі М. Танкам ужываюцца нацыянальна-дэтэрмінаваныя онімы, у выніку чаго ствараюцца індывідуальна-аўтарскія метафары, якія падкрэсліваюць гісторыка-культурны кантэкст і нацыянальны каларыт узноўленай аўтарам мастацкай рэчаіснасці: *Можа, лепей заваліцца, пераплыўшы Дзвіну-Лету, / вочы сплюшчыўшы ад дожджу нейдзе захінуцца ў цень?* [8, т. 1, с. 222]; *Зараз / Амаль кожны дзень / Вяртаюцца ў свой Пантэон Беларусі / Васкрэслыя цені герояў…* [8, т. 6, с. 243].

Яркім сродкам мастацкай выразнасці з'яўляецца і анамастычнае параўнанне, у аснове якога ляжыць эмацыянальна-суб'ектыўная ацэнка прадмета ці з'явы аўтарам. Ролю эталона, ацэначнага стэрэатыпа выконвае прэцэдэнтная адзінка як аб'ект параўнання, дзякуючы здольнасці актуалізаваць іншыя прэцэдэнтныя феномены – тэксты, выказванні і сітуацыі, што, напрыклад, выразна ілюструецца ўвядзеннем у мастацкі кантэкст агульнавядомых міфонімаў. У якасці падстаў для параўнання выступаюць такія інтэгральныя прыкметы, як падабенства сітуацый, супадзенне ўмоў і абставін дзеяння, падабенства рысаў характару, унутраных якасцей аб'екта і суб'екта параўнання, іх знешняе падабенства: *Прайшоў праз патокі / З крутымі, як Сцікс, берагамі, / Праз скіфскія стэпы, / Дзе звёў яго лёс з чумакамі* [8, т. 4, с. 19]; *Як Цыклоп, / На вуліцы ліхтар падслепаватым вокам / Шукае Адысея ля вітрыны з хлебам* [8, т. 6, с. 275]; *Ну як з табой памілавацца?! // У мерзлым віленскім пакойчыку / Сядзіць ля грубкі твая маці / Са сваім неадлучным коцікам / І пераматвае пражу, / Як Пенелопа, вяжа, вяжа…* [8, т. 6, с. 313].

МГПУ им. И. П. Шамякина

**Заключэнне**

Універсальна-прэцэдэнтны характар разгледжаных паэтонімаў абумовіў іх выкарыстанне ў якасці дзейсных экспрэсіўна-ацэначных і вобразастваральных сродкаў, якія значна ўзбагацілі ідэйна-мастацкую сістэму паэтычных твораў М. Танка, дадаўшы ім асаблівую эстэтыку і інтэлектуальна-вобразнае гучанне. Прыналежнасць выяўленых уласных імёнаў да семантычнага поля «Антычнасць», іх канатацыйны патэнцыял, здольнасць да актуалізацыі экстралінгвістычнай, пазатэкставай інфармацыі дэтэрмінавалі ўключэнне прааналізаваных мастацкіх твораў у шырокі інтэртэкстуальны кантэкст.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў па дагаворы № Г22М-038 ад 04.05.2022 г.*

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Жыганава, А. П. Асаблівасці ўвасаблення антычных вобразаў у лірыцы Максіма Танка 1980–1990-х гг. [Электронны рэсурс] / А. П. Жыганава // Восьмыя Танкаўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 верас. 2012 г. / БДПУ імя М. Танка ; рэдкал.: В. Д. Старычонак [і інш.]. – Рэжым доступа: https://elib.bspu.by/handle/doc/14049?mode=full. – Дата доступа: 02.07.2023.

2. Каваленка, В. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.

3. Кабаковіч, А. Фальклорныя і анталагічныя традыцыі ў беларускай паэзіі : гісторыка-тэарэтычны нарыс / А. Кабаковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 127 с.

4. Лебядзевіч, Д. Антычныя традыцыі ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX ст. : дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / Д. Лебядзевіч. – Гродна, 1997. – 107 с.

5. Шамякіна, Т. Міфалогія і беларуская літаратура : нарысы, эсэ. / Т. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 392 л.

6. Юдзянкова, Г. Міфалогія як сфера-крыніца ўніверсальна-прэцэдэнтных антрапонімаў / Г. Юдзянкова // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. – 2009. – № 4 (25). – С. 128–133.

7. Никонов, В. А. Имя и общество / В. А. Никонов. – М. : Наука, 1974. – 278 с.

8. Танк, М. Зб. тв. : у 13 т. / Максім Танк ; НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2006–2012. – Т. 1 : Вершы (1930–1939). – 2006. – 374 с.; Т. 3 : Вершы (1954–1964). – 2007. – 447 с.; Т. 4 : Вершы (1964–1972). – 2007. – 384 с.; Т. 5 : Вершы (1972–1982). – 2008. – 448 с.; Т. 6. : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.

9. Словарь античных крылатых слов и выражений с примерами из русской литературы [Электронны рэсурс]. – Рэжим доступа: https: //www.russianlutheran.org/gymnasium/slovar/slovar.html. – Дата доступа: 05.07.2023.

10. Никонов, В. А. Введение в топонимику / В. А. Никонов. – 2-е изд. – М. : Изд-во ЛКИ, 2011. – 184 с.

11. Кузнецов, С. А. Большой толковый словарь русского языка : А-Я / РАН. Ин-т лингв. исслед. ; сост., гл. ред. С. А. Кузнецов. – СПб. : Норинт, 2000. – 1536 с.

*Паступіў у рэдакцыю 04.09.2023*

E-mail: olgaslivets@mail.ru

V. R. Slivets

PRECEDENT PHENOMENA OF THE SEMANTIC FIELD “ANTIQUITY”
IN THE POETONIMICON OF MAXIM TANK’S WORKS

The article focuses on the description of the specifics and ways of functioning of the precedent phenomena of the semantic field «Antiquity» in the poetonymicon of Maxim Tank’s works. The corpus of relevant units is systematized, and it is concluded that the universal-precedent character of the examined proper names contributed to the creation of a wide intertextual context, and also conditioned their use as expressive-evaluative and visualizing means.

Keywords and phrases: onomastic metaphor, intertextuality, mythperson, mythonym, simile, poetonymicon, precedent phenomenon, toponym.

МГПУ им. И. П. Шамякина